# ДРАМА РЭПРЭСІРАВАНАГА ТВОРЦЫ (ПАВОДЛЕ ВЕРША ЯЗЭПА ПУШЧЫ “ВЫСТРЫГАЛІ З ФОТАКАРТАК…”)

*Г. Ю. Грыга*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** На аснове аналізу верша Язэпа Пушчы “Выстрыгалі з фотакартак” даследуецца драма рэпрэсіраваных беларускіх пісьменнікаў. Звяртаецца ўвага на сродкі мастацкай выразнасці, выкарыстаныя паэтам для вырашэння мастацкай задачы.

**Ключавыя словы:** Язэп Пушча; паэзія; рэпрэсіі; рэабілітацыя; сімвал; беларуская інтэлігенцыя.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца павышаная цікавасць грамадскасці да праблемы рэпрэсіраваных у савецкі час пісьменнікаў. Так, напрыклад, у газеце “Камсамольская праўда ў Беларусі” змешчаны шэраг матэрыялаў на гэту тэму, падрыхтаваных Сяргеем Трафілавым. Адзін з іх – “Са згоды Сталіна ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937-га расстралялі 132 беларускіх пісьменніка і інтэлігента” [3] – размова з літаратуразнаўцам Ціханам Чарнякевічам пра знішчаных дзеячаў навукі, культуры і мастацтва міжваеннай пары, сярод якіх 22 вядомых беларускіх літаратара. У якасці ілюстрацыі журналіст падрыхтаваў інфаграфіку, што вельмі наглядна паказвае маштаб рэпрэсій. Гэта стары фотаздымак, на якім чырвоным крыжам перакрэслены тыя, хто быў рэпрэсіраваны: з адзінаццаці змешчаных на фота беларускіх пісьменнікаў пяцёра расстраляны ў згаданую ноч, чацвёра высланы або падвяргаліся ціску. Янка Купала і Якуб Колас, напрыклад, вымушаны былі напісаць “пакаяльныя лісты” і прызнавацца ў неіснуючых грахах.

У гісторыі Беларусі ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года займае асаблівае месца. Зараз гэту дату называюць “чорнай ноччу”, якая стала своеасаблівым адлюстраваннем жыцця грамадства, стану нацыянальнай славеснасці і культуры ў канцы 1930-х гадоў. Увогуле ж падчас рэпрэсій была фізічна знішчана лепшая частка беларускай інтэлігенцыі. Менавіта 1930-я гады з’яўляюцца адным з самых складаных і трагічных перыядаў у айчыннай гісторыі.

Мала каму з пісьменнікаў пашчасціла ўцалець і вярнуцца на радзіму. Адзін з іх – Язэп Пушча, актыўны і таленавіты сябра “Маладняка”, а пасля і “Узвышша”. 24 ліпеня 1930 года Язэпа Пушчу арыштавалі і разам з іншымі літаратарамі і грамадскімі дзеячамі абвінавацілі ў прыналежнасці да антысавецкай арганізацыі “Саюз вызвалення Беларусі”. Прысуд – пяць гадоў высылкі. Здавалася, што ў 1935 годзе жыццё пісьменніка вернецца ў сваё рэчышча, але гэта вызваленне было толькі намінальным. Язэп Пушча не меў права вярнуцца на радзіму, ды і вяртацца было небяспечна: там пачыналіся паўторныя арышты яго таварышаў. Былому арыштанту не дазвалялася сяліцца

ў вялікіх гарадах, а з-за ўсеагульнай падазронасці і недаверу цяжка было знайсці працу. Паэт быў рэабілітаваны ў 1956 годзе, аднак на Беларусь вярнуўся толькі праз чатыры гады [1, с. 341].

Верш "Выстрыгалі з фотакартак…" (1960) раскрывае жыццёвую драму тых, хто застаўся жывым, але так і не змог вярнуцца да ранейшага жыцця, стаць паўнавартасным членам грамадства. Гэты твор як гімн усім, хто за свае старанні, адданасць, за сваю творчасць і намер служыць роднай зямлі атрымаў "камень, а не хлеб", бо ўсё, пра што яны так палымяна марылі і што з такой апантанасцю і энергіяй рабілі, "у нябыт … сплыло". Гэтыя людзі не толькі былі прыбраны з фотаздымкаў, а нават выкраслены з гісторыі. На думку ўлады, таленавітая і натхнёная літаратурная моладзь, якая гучна заявіла пра сябе творчай дзейнасцю, не прынесла нічога добрага – іх выключны і разнапланавы ўнёсак у літаратуру ігнараваўся і ўрэшце амаль забыўся: *"Праўда, быў такі калісьці, / Толькі лепш, каб не было, – / Не прынёс ані карысці, / У нябыт усё сплыло"* [2, с. 225]. Таму Язэп Пушча акрэслівае гэтыя акалічнасці з нейкім расчараваннем, сумам ад несправядлівасці, вялікай тугой і пытаннем без адказу: чаму ўсё так?

Ужо ў назве пазначана праблема, якая і будзе разглядацца ў вершы. Нягледзячы на час напісання – 1960 год, – чытачу ўсё роўна зразумела, што вытокі праблемы і асабістай драмы аўтара ў 1930-х. Менавіта тады ўлады асабліва актыўна "выкрэслівалі" найбольш яркіх асоб з фотакартак і з жыцця.

Верш адносіцца да твораў грамадзянскай лірыкі, бо ў ім выяўляюцца актуальныя і грамадска значныя праблемы таго часу: таталітарная сістэма ўсталявала жорсткія і бязлітасныя межы для прадстаўнікоў нацыянальнай літаратуры і культуры, пазбавіўшы інтэлігенцыю права свабодна ствараць і выяўляць арыгінальнае "я". Адначасова гэта вельмі асабісты твор – споведзь паэта пра тое, з чым яму давялося сутыкнуцца, як яго прынялі былыя сябры, як яго сустрэла Беларусь, пра якую ён марыў і да якой імкнуўся.

Язэп Пушча паўстаў з нябыту, а многія яго калегі-пісьменнікі былі знішчаны – выстрыжаны з фотакарткі навечна, як Адам Бабарэка, Міхась Зарэцкі, Міхась Чарот, Алесь Дудар, Анатоль Вольны…

У вершы "Выстрыгалі з фотакартак…" канцэптуальна значным выступае вобраз каменя, які сімвалізуе вялікі цяжар на душы ацалелых і рэабілітаваных, але так і не вернутых да паўнавартаснага жыцця пісьменнікаў. У вершы ўзнікаюць апазіцыі "камень – хлеб", "чэмер – віно": хлеб у дадзеным кантэксце сімвалізуе прызнанне і прыняцце, якіх так і не атрымалі бязвінныя ахвяры рэпрэсій; чэмер (атрута) увасабляе расчараванне і адрынутасць; віно – дастатак і прызнанне. *"Вось як сталася яно, / І ці думаў ты, Язэп? / Чэмер п'еш, а не віно, / Дораць камень, а не хлеб"* [2, с. 225].

Верш "Выстрыгалі з фотакартак…" прымушае да роздуму над гісторыяй нашай краіны, адсылае да перыяду, калі гвалтоўна "выдаляліся" з гістарычнай плыні найбольш яркія і таленавітыя асобы, што былі на творчым узлёце і ў росквіце сіл. Твор Язэпа Пушчы – яскравае сведчанне таго, як таталітарная сістэма руйнуе жыцці асобных людзей, змяняе натуральны ход культурна-

грамадскага развіцця, збядняе літаратуру, уплывае на лёсы наступных пакаленняў і ўсяго народа.

### Літаратура


1. Заяц, Н. В. Пушча Язэп / Н. В. Заяц // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. – Т. 8 : Беларуская літаратура ; В. У. Ваніна (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 341–344.
2. Пушча, Я. Збор твораў : у 2 т. / Я. Пушча. – Мінск : Маст. літ., 1994. – Т. 2 : Вершы. Паэмы. – 464 с.
3. Трефилов, С. С согласия Сталина в ночь с 29 на 30 октября 1937-го расстреляли 132 белорусских писателя и интеллигента : интервью с Т. Чернякевичем [Электронный ресурс] / С. Трефилов // Комсомольская правда. Беларусь. – 2017. – 27 окт. – Режим доступа: https://www.kp.by/daily/26750.7/3778956/. – Дата доступа: 10.03.2021.


## РАМАН У. ЛІПСКАГА “ЦАР”: БЕЛАРУСКІ МАРШРУТ МАРЫНЫ МНІШАК


*Г. А. Лукашэвіч*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле прасочваецца “беларускі маршрут” Марыны Мнішак, узноўлены ў рамане У. Ліпскага “Цар”. Вызначаецца ідэйная накіраванасць твора.



**Ключавыя словы:** У. Ліпскі; раман; “Цар”; сюжэт; маршрут.


Беларускі празаік У. Ліпскі папоўніў свой багаты творчы набытак, звярнуўшыся да жанру гістарычнага рамана. У 2020 годзе выйшаў яго буйны твор “Цар” (іншая назва – “Царскае каханне”), які вяртае чытача ў глыб стагоддзяў і распавядае пра стасункі царэвіча Дзімітрыя і Марыну Мнішак. Менавіта Марына Мнішак стала першай каранаванай у расійскай дзяржаве жанчынай.

Гісторыя кахання зацікавіла У. Ліпскага і паклала пачатак для стварэння вялікага мастацкага палатна. “Цар” – гэта дэбют пісьменніка ў такім грунтоўным і складаным жанры. Каб надаць пераканаўчасці аповеду, пісьменнік завочна вандраваў па маршруце Марыны Мнішак – з дапамогай вывучэння архіваў, чытання навуковай і мастацкай літаратуры. Аўтар даследаваў літаратальна кожны яе крок ад Брэста да Оршы. А яна ў свой час з абозам у дзве тысячы падвод праехала звыш дваццаці беларускіх гарадоў,